Ганна СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ

# КАРМУШКА ДЛЯ ЗАЙЧЫКА







Зімовым днём вавёрачка Адважка скакала дадому. Раптам яна заўважыла зайчыка Вушасціка. Той сядзеў на пяньку і слухаў сінічку. Адно вушка ў яго было сагнутае, а другое тырчала. Лапкамі мысачку падпёр і замілавана ўсміхаўся. А сінічка нешта цыфікала, пінькала.

— Цудоўная твая песенька, сінічка! — пахваліў птушачку Вушасцік. — Цяпер зіма, дык птушкі не спяваюць.

А хітрая вавёрка ціхенька апусцілася ніжэй і навастрыла вушкі.

Сінічка расказвала пра сваё жыццё:

— Цы-цы-фі, цяпер я ў лесе жыву. Дзяцел Дзяўбун падарыў мне домік, — пачула вавёрачка Адважка.

— Ведаю я Дзяўбуна, ведаю, — кіўнуў галавой звярок. — Я — Вушасцік. А як цябе клічуць?

— Пінь-пінь-фі, Маняшай. Я раней у вёсцы жыла. Дзяўчынка Маша вельмі любіла мяне і назвала так. Яна ж таксама Маняша. Толькі скарочана — Маша. Калі я прылятала на кармушку, дзяўчынка адразу ўскліквала: “Мама, Маняша прыляцела! Трэба сала свежага падвесіць!”



— Сала?! — здзівіўся Вушасцік і выпрастаў другое вуха. Ён так рабіў, калі чуў нешта вельмі дзіўнае.

— Пінь-пінь, так, мы, сініцы, любім сала. Увесну і ўлетку мы дастаём з-пад кары дрэў чарвячкоў, а зімой іх няма. Добрыя людзі, як мая Маша, падвешваюць для нас сала. Яно дапамагае нам выжыць у голад і холад.



— Сала і мяса ваўкі ядуць, але каб сінічкі... — развёў лапкі ў бакі Вушасцік.

— Пі-пі-пінь, мы і зярняткі розныя любім, — прапінькала птушка.

— Добра табе было ў вёсцы?

— Пі-пі, мне і цяпер добра — домік свой ёсць. А на тую кармушку я лётаю. Колькі тут да вёскі — крылом падаць.



